Анатоль КОЗІЧ

# Нечаканы шпацыр

Па небе хмары – не відна ночы.
А за сцяною – дажджом у вочы.
Застогне цяжка і барабаніць.
Дажджу прыстала зямлю пабавіць.

Якога смутку, ды зноў не спіцца?
Ці смага душыць? Папі вадзіцы.
А ўсё ж застынеш каля акенца,
Далонь прыцягнуць сляды на шкельцы.

І розум кажа, што дождж халодны,
Не да шпацыру, бо час нягодны.
Наогул позна, ды змокнеш хутка,
Ды й шчэ прамочыш любы абутак.

Не ўтрымаюць цяпло і ложак.
Не чалавек ужо, а мокры вожык.
Ты хутка прыйдзеш назад, сагрэцца.
Дажджом бы змыта туга на сэрцы.

І не забілі дажджу струмені,
Не напужалі вятры і цені.
На небе хмары – не відна ночы.
Ляжыш у ложку. Заплюшчы вочы.